Источник: **«Наша слова» - 2012-06-27**

## БДУ арганізуе Міжнародную летнюю школу беларускай мовы

З 25 чэрвеня па 7 ліпеня на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта па вуліцы Карла Маркса, 31, будзе арганізавана Міжнародная летняя школа беларускай мовы.

Як паведаміла прэс-служба БДУ, яе ўдзельнікамі стануць студэнты, магістранты і аспіранты з вышэйшых навучальных устаноў Расіі, Украіны, Польшчы і Сербіі. На практычных занятках яны будуць вывучаць беларускую мову або ўдасканальваць свае веды ў ёй. У праграму ўключаны таксама экскурсіі па гістарычных месцах Мінска і Беларусі, наведванне музеяў і іншых культурных цэнтраў, сустрэчы з дзеячамі беларускай культуры і навукі.

У ходзе цырымоніі адкрыцця школы 26 чэрвеня да ўдзельнікаў з прывітальным словам звернуцца рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка, дэкан філалагічнага факультэта ВНУ Іван Роўда і старшыня Міжнароднага камітэта славістаў член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Аляксандр Лукашанец.

***Анастасія Янушэўская, БелаПАН.***